№ 42 Ausgabe B.

ГОМАН

Беларуская Віленская часопіс
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакціі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрації і экспэдыції:
М. Стэфанская 23.

Цэна с перэсылкай і дастаукай да хаты:

на 1 год—4 м. 80 фэн., на ½ году—2 м. 40 ф., на 3 месяцы—1 м. 20 ф., на 1 мес.—40 фэн.

№ 42 (238). Год III. Вільня, 24 мая 1918 г. Цэна 5 фэн. (3 кап.)

У Суботу 25 мая у касьцёлі сьв. Яна а 10 гадз. нараніцы адбудзецца жалобная імша за ўсе ахвяры вайны— афіцэраў і салдатаў усіх нацый, забітых навайне.

23 мая.

Заходні тэатр:

У ваколіцах Кэмэля крапчэйшы агонь. У начы ажывілася чыннасць французаў на заходнім беразі Авр. Мейсцовые наступленьні ворагаў адбіты; узяты пры гэтым палонные. На полі бітвы на Ліс мы зьбілі ўчора 3 амэрыканскіе самалёты. Часьцейшые французкіе налёты на бэльгійскіе ваколіцы зрабілі цяжкіе шкоды цывільнаму насяленьню.

Вялікіе склады амуніції на паўночным заходзі ад Абвіль зьнішчэны ўдачна скінутымі бомбамі. Парыж абкідан бомбамі.

ЛЮГАНО. „Corr. d. Sera“ друкуе справаздачу аб палажэньні італьянскіх чыгунак, на каторых пануе хаос. Прападаюць с таварамі ня толькі паадзінокіе вагоны, але і цэлые поезды. Вышэйшые чыны занімаюцца прадажай пазваленьняў на правоз тавараў. Былі прыпадкі умысных сустрэч поездаў, каб укрыць нестачу перэсыланых тавараў. Газэта апаведае аб чысьленых напасьцях на поезды ў дарозі і друкуе пратэст жалезнадарожнікаў, каторые, між іншым, трэбуюць, каб поезды хадзілі з жандарскай вартай.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 23.V. „Nordd. Allg. Ztg“ піша:

Экономічная ўмова між Нямеччынай і Швэйцарыей падпісана ўчора с тым, што яе павінны пацьвярдзіць абодва ўрады. З вялікім здаволеньнем можэм адзначыць, што, ня гледзячы на чысьленые прашкоды і патайную работу ворагаў, удалося дайсці ўдачнай развязкі, каторая нямецка-швэйцарскім экономічным зносінам дае ізноў на доўгі час крэпкі фундамэнт. Умова гэта становіць рэзультат абапольнага жаданьня абодвых народаў знайсьці аснову дзеля поўнай згодлівасьці ў найбольш важных дзеля абедзьвых старон справах.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 22.V. На сабраньні торговай палаты статс-сэкрэтар Кюльман прачытаў лекцію аб румынскім міры. Між іншым, ён сказаў:

«Румынія с прычыны свайго нечувана шыбкага экономічнага расцьвету была перад вайной у у незвычайна добрым палажэньні. Пасьля няшчырага і ў сваіх падробнасьцях варожага да нас неўтралітэту румынскі ўрад увёў свой народ у дрэнна прыгатаваную вайну, каб правясьці ў жыцьцё ідэю імперыі Дація — балканскай вялікай дзержавы з 12-14 мільёнамі жыхароў. Мара нарысованая спрытнымі агентамі саюзьнікаў, пацягнула за сабой румынскіе кіраўнічые кругі, а народ пазволіў сябе ўцягнуць у вайну без ахвоты і жаданьня. Заблутанасць пытаньняў, зьвязаных з мірам, тлумачыцца тым, што гэта быў мір Коаліціі. Для Нямеччыны аб захваце зямель не магло быць гутаркі. Затое мы дайшлі значных экономічных карысьцяў. Заплата, якую Румынія павінна даць папярнеўшым нашым землякоm, гэта — контрыбуція. Наша балканская палітыка будзе кіравацца да таго, каб умацавацца экономічна на Балканах, каторые зьвязываюць Эўропу с пярэдняй Азіей“.

БЭРЛІН. У Ліфляндзіі і Естляндзіі адчынены пачтовые канторы ў Балтыцкім Порце. Гапсалю, Лемсалю, Нарве Пэрнове, Вэйзэнштэйне, Верро і Вэзэнбэргу, дзе прынімаюць пісьмы і тэлэграмы з і ў Нямеччыну і генэрал-губэрнатарства варшаўскае, а такжэ пісьмы з і ў Аўстрыю.

БЭРН. У Франціі шмат у якіх фабрыках амуніції узняліся забастоўкі дзеля пратэсту проці пасылкі мобілізованых работнікаў набораў 1910—1912 г. на фронт. Каб недапусьціць задзэржкі работы ў фабрыках, урад замяніў мобілізованых работнікаў амэрыканскімі салдатамі. З гэтай прычыны ў Ліоне адбыліся сур'ёзные крывавые стычкі.

БЭРН. С прычыны нестачы бавоўны ў Англіі выдан прыказ, каб ад 10 чэрвеня число працуючых шпулек у фабрыках было паменшэно на 50%, а чысло гадзін работы — ад 55 да 40 гадзін у тыдзень. У прыказе разам с тым гаворыцца, што палажэньне—вельмі сур'ёзнае і ў найбліжэйным часе зробіцца яшчэ больш сур'ёзным, калі дзеля падвозу бавоўны не дадуць больш караблёў.

ВЕНА. У сталічным месьці Карынтыі, Клягэнфурце, была устроена дэмонстрація проці палудзенна-славянскай пропаганды. Прынята рэзолюція проці утварэньня палудзенна-славянскага гасударства, якое загарадзіло бы вольную дарогу да Адрыатыцкага мора як для немцаў, так і для іншых народаў Аўстрыі.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. 22.V. Учора увечары імператар Кароль з жонкай выехалі назад. Султан праводзіў гасьцей на вагзал.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр) 22.V. Прэзыдэнт Вільсон зацьвярдзіў закон, паводлуг каторага карацімуць за ўсе паступкі і словы проці вернасьці бацькаўшчыне.

Незалежная Беларусь.

Беларускіе дэлегаты у украінскага міністра.

Як наказывае «Кіевск. Мысьль», члены дэлегації Беларускай Народнай Рэспублікі, С. Рак-Міхалоўскі, А. Цьвікевіч і праф. В. Доўнар-Запольскі былі у новага украінскага міністра заграгічных спраў, Васуленкі, і адбылі з ім нараду аб беларуска-украінскіх граніцах, беларускай тарговай палаце на Украіне і тарговых зносінах абедзьвых дзержаў. Ня гледзячы на заявы нямецкіх, польскіх і аўстрыяцкіх газэт, *ніякіх перэгавораў аб „беларуска-украінскай уніі“ дэлегація ні с кім с членаў украінскага ураду не вела.*

Павялічэньне складу Рады.

Камісія дзеля выработкі наказу апрацоўвае рэформу прэдстаўніцтва ў Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі стае прычыны, што чысьленые беларускіе правінцыональные рады і беларускіе нацыональные організаціі дабіваюцца мейсца для сваіх дэпутатаў у Радзе. Рада с кожным днём здабывае ўсё болей і болей прыхільнікаў с прычыны правільнасьці і цьвёрдасьці палітыкі, якую яна вядзе ад дня апавешчэньня незалежнасьці Беларусі. Асабліва цягнуцца да Рады ўцекачы з Горадненшчыны і Віленшчыны, спадзяючыся, што яна даб'ецца злучэньня ўсіх Беларускіх зямель.

Выхад з Рады.

Камітэт жыдоўскай соц.-дэм. партыі «Поалей-Ціон» узяў назад з Рады свайго прэдстаўніка, д-ра Айзэнштадта. На свабоднае мейсцэ жыдоўскага прэдстаўніка жыдоўскае грамадзянства прысылае ў Раду прэдстаўніка так-званых «ортодоксаў».

Наказ правінцыональным радам.

Па загаду Народнага Сэкрэтарыату, народны Сэкрэтар А. Смоліч апрацаваў падробны наказ для правінцыональных беларускіх рад (— аб іх організаціі, ўзаемных адносінах, рабоце, задачах і т. д.). Наказ гэты зацьверджэн Сэкрэтарыатам.

Экономіка і палітыка.

Шырокіе палітычные концэпціі, каторые выплываюць з істотных патрэб жыцьця народу і краю, могуць сустрэчаць на сваей дарозі многа перашкод, могуць зьменяць сваю форму, але аснаўны іх зьмест астаецца заўсёды *нязьменным.*

Гэтак сама нязьменнай астаецца цяга Беларусі да Балтыцкага мора, — тая самая цяга, каторая згуртавала прад векамі беларускіе плямёны разам з літоўскім, і вызвала да жыцьця Беларуска-Літоўскую дзержаву. І ўсе беларускіе палітычные концэпціі ад найдаўнейшых часоў былі асновані на гэным цягаценьні, хоць, залежна ад варункаў, зьмянялі сваё выражэньне. Мы ведаем, як у XVII сталецьці магнацкі род кн. Радзівіллаў надумаў адарваць Беларуска-Літоўскі Край ад Польшчы і ўвайсьці ў саюз са швэдамі, каторые тады ваевалі с Польшчай. Мы ведаем, што за часоў Напалеона наш край так сама думаў адарвацца ад Расейскай дзержавы —ад чужога для нас Усходу, што праз увесь XIX век палітычна сьвядомые элемэнты яго вялі барацьбу з маскоўскім панаваньнем, што, ўрэшці, ў рэволюцыйные 1904—1905 гады быў кінут кліч палітычнае незалежнасьці Беларусі і Літвы. Дый тады ўжо выплыла наверх концэпція зьбліжэньня нашага краю с Курляндзіей: жывы сьведка гэтага—проціваенная адозва с 1904 году, выданая за подпісам латышскай соцыал-дэмократыі, беларускай соцыалістычнай грамады, літоўскай соцыал-дэмократычнай партыі і п. п. с. у Літве ў чатырох мовах: па латышску, па беларуску, па літоўску і па польску. І на чысьленых конгрэсах і конфэрэнціях народаў старой Расеі (аўтанамістаў-фэдэралістаў, соцыалістычных партый і інш.) беларусы, літвіны і латышы заўсёды знаходзілі грунт дзеля згодных, солідарных выступленьняў: усе тры нацыональные групы ведалі, што іх злучаюць экономічные інтэрэсы —той цэмэнт, які злучае рознародные народы ў гасударствы і дзержаўные саюзы. Урэшці, найбольш поўнае і яркае выражэньне гэта палітычная концэпція знайшла ў дэкляраціях беларусаў у часе окупаціі ў Вільні, а ад заняцьця немцамі Менску—і па той бок старога фронту. І ў тахт з гэтым мы чыталі ў леташніх газэтах, што рада раб. і салд. у Рызе выказала жаданьне аб фэдэраціі Курляндзіі з нашым краем.

Праўда, пад той час, як ішлі гутаркі аб злучэньні на фэдэрацыйных асновах нашага краю з Балтыцкімі землямі, культурная блізкасць і суседства беларускага і украінскага народу прымушала беларусаў звертаць вочы і на палудзень. Але тут справа апіралася на зусім іншых асновах: на аналёгіі праўнага (ці, справядлівей, безпраўнага) палажэньня пад Расеей абодвых народаў і на патрэбе солідарнасьці ў барацьбе іх з маскоўскімі захватнымі апэтытамі. І хоць, маючы надта доўгую граничную лінію, маючы супольны водны шлях — Днепр, Беларусь і

Украіна мелі заўсёды такжэ і зносіны торговые, аднак, цягаценьне абедзьвых старонак да двох розных мораў: Беларусі—да Балтыцкага, Украіны—да Чорнага—выключало думку аб супольнай дзержаве, і гутарка заўсёды ішла толькі аб болей ці меней блізкай зьвязі беларуска - літоўска - латышскага комплексу з зусім асобным гасударственым організмам - Украінай.

Ход палітычных здарэньняў: апавешчэньне незалежнасьці Курляндзіі і Літвы з далучэньнем іх да Нямеччыны—вызваў у першы момэнт думку: а як-жэ будзе з Беларусьсю? Знайшліся нават людзі, каторым здалося, што старая беларуская палітычная концэпція утраціла грунт пад нагамі. Аднак, удумаўшыся ў тое, што сталося, мы не бачым нічога, што магло бы зьмяніць нашае цягаценьне да Балтыцкага мора і перанесьці цягу Беларусі з заходу на ўсход — да Вялікарасеі, або на палудзень — праз Украіну да Чорнага мора, ці ўрэшці да Польшчы. Ні Нёман, ні Дзьвіна не пацяклі назад; наадварот, усё суліць новае развіцьце і ажыўленьне гэтых водных дарог. Далечыня Балтыцкага мора і портаў яго (Лібава, Рыга, с каторымі наш край крэпка зьвязан жалезнымі дарогамі, асталася тая-ж самая. Як і даўней, мы можэм і будзем прадаваць свой хлеб і свой лес Нямеччыне. скуль да нас будуць ісьці яшчэ доўгі час уселякіе машыны і іншые фабрычные вырабы. Перамена ёсць толькі адна: с прычыны таго, што этнографічная Літва і Курляндзія ўжо ўходзяць у склад *нямецкай экономічнай сыстэмы* і што еднасць беларусаў з літвінамі і Балтыцкімі землямі была *патрэбна дзеля свабодных экономічных зносін Беларусі перш за усё с тэй-жэ Нямеччынай*, —на першы плян выступае цяпер справа наладжэньня *беларуска-нямецкіх адносін* у постаці саюза, роўна карыснага і патрэбнага для абедзьвых старон. І ад таго, ці і як будзе той саюз праведзен, залежаць далейшые адносіны Беларусі з Літвой і Курляндзіей, а пытаньне аб іх форме развяжэцца згодна с патрэбай *найбольш раціональнага наладжэньня экономічнага жыцьця* трох памянутых краёў.

Х. Х.

Польская сіла на Украіне.

Барацьба беларусаў с палякамі — гэта ня толькі барацьба між дзьвема нацыянальнасьцямі за панаваньне ў нашым краю: у аснове яе ляжыць спрадвечны антагонізм паміж панствам, разарваўшым нацыональную зьвязь са сваім народам, і народнымі масамі — *дэмосам беларускім*.

Дый ня толькі ў нас нацыональная барацьба зьліваецца з барацьбой соцыяльнай: такіж самы абраз бачым мы ў суседняй Украіне. Аб гэтым красамоўна гавораць цыфры, і мы перэдрукоўваем тут жменю іх с польскай газэты „Dziennik Polski“ (№ 132).

Як вядома, расейскі ўрадовы сп с 1897 году (вельмі непрыхільны як для беларусаў, так і для украінцаў паказываў на Украіне *больш за 20 мільёнау украінскага насяленьня* і толькі *каля паумільёна палякоу*. Аднак, як паказываюць цыфры, дадзеные ў «Dz. P.» для Валыні, Падольля і украінскіх губэрняў (паводлуг расейскай тэрмінолёгіі, — значыць, Кіеўскай, Палтаўскай і Чарнігаўскай), на гэтым абшары ў польскіх руках апынулося:

нерухомасьцей — на 29.326 277 руб.
зямлі — 2.306 059 дзесяцін, а ў руках усіх іншых жыхараў краю:
нерухомасьцей — на 34.913,372 руб.
зямлі — 2.703.293 дзесяціну.

У працэнтах польскае нерухомаеменьне даходзіць 46,5%, а цэннасць зямлі ў польскіх руках паводлуг ацэнкі перад вайной - ад 600 да 650 мільёнаў рублёў.

Цікава адзначыць, што ўся гэна «польская» земля належыць да 6 050 валадзельцаў, і на кожнага з іх сярэднім лікам выпадае каля 400 дзес. цаной больш за 100.000 руб. У часох маскоўскага панаваньня царская сыстэма ўпраўленьня кіравалася да таго, каб нацыональна сьвядомай украінскай інтэлігэнціі не даць мейсца да працы на роднай зямлі. На яе мейсца прысылалі цэлые хмары расейскіх чыноўнікаў, але, ня гледзячы на „поўнату ўласьці“ апошніх, побач з імі развівалася і ўмацавалася польская перэвага, выплываючы з матэрыальнай сілы палякоў. — Цяпер мейсца маскоўскіх чыноў занімаюць украінцы, але ім прыходзіцца бароцца с палякамі, матэрыальнае палажэньне каторых асталося нязьменным.

Ня дзіва, што і новы гэтман Украіны гаворыць аб патрэбе пераходу панскіх зямель у рукі народу, хоць і за плату. Але ўжо і цяпер — і то асабліва цяпер, калі кладзецца фундамэнт Украінскай незалежнай дзержавы, трэба бароцца с польскім панаваньнем, і найлепшы способ у гэтай барацьбе — гэта дэмократызація ўсяго грамадзкага і гасударственнага жыцьця Украіны. Толькі тады матэрыяльная перэвага палякоў страціць сваю сілу, калі багацьце перэстане даваць людзём розные прывілеі І новы украінскі ўрад, ня гледзячы на тое, што гэтманшчына мае ўсе характэрные адзнакі монархіі, будзе прымушэн ісьці па дарозі дэмократызму: гэта — фундамэнт нацыональнай палітыкі на Украіне.

Мы думаем, што тое ж можна сказаць і аб нашай бацькаўшчыне: і тут панаваньню польскага панства настане канец, калі ўвесь народ будзе прызван да будаваньня свайго дзержаўнага жыцьця. — незалежна ад формы гасударственай уласьці.

І. Мелешка.

АПЯКУН.

(*Байка*).

Не дарма прыказка ў народзе:
Беда адна к нам не прыходзе.
У вялікім і багатым месьці,
Здаецца, на усходзі гдзесьці,
Удава йшчэ моцная кабета,
Памёрла раптам. Праўда гэта,
Што сьмерць людзём не навіна,
Алеж пакінула яна
Дзяцей, каторых гадавала,
Тых, што дадзенна луццавала
І так таўкла, як крупы ў ступе,
Затое, што трымала ў купе.
Нешчасные не зналіб дзеці,
Куды сябе з бядой падзеці,
Каб с сэрцэм людзі не знайшліся,
Што памагчы ім узяліся.
Суседзі, бачыце, успомніўшы аб Богу,
А можэ ўгледзіўшы сабе перэсьцярогу,
Сказалі, як адзін: „Поможэм,
Чым можэм!
Знайшлі Марыльцэ жаніха, —
Была дзяўчына у парэ!
А Пятруся за пастуха
Служыць аддалі у дварэ.
— „Камуж-бы Яначку аддаць?“
Гадкоў, здаецца, меў ён с пяць.
— „Ну што ж, хай будзе мой хлапец,“
Сказаў знаёмы ўсім шавец,
Які ў суседнім жыў даму.
Шаўцу таму
Ніхто дзяцей сваіх ў навуку не даваў,
Бо кожны добра знаў,
Што у шаўца дзіцяці — мука, не навука!
Сам п'яніца, гультай і абібок,
А з вучняў выціскаў увесь сок:
Бывало, да цемна сушыў іх за работай!
— «Я, кажэ, хлопчыка з ахвотай
Сабе вазьму.
«Імя сваё і цэх яму
«І хлеб штодзенны дам.»
Дык мо' здаецца вам,
Што праўду шчырую пачуў ён ад народу?
— Суседзі далі згоду!
Рацыю трэба вам? — заўсёды слабым горэ, —
Увесь сьвет так гаворэ.

(«В. Б.»). **А. Гарун.**

У Вільні і ваколіцах.

× **Выстаўка беларускіх культурных памятнікаў**, ладжэная пад кірункам рэдакціі «Zeitung der 10. Armee», як мы даведаліся, будзе ўжо скора адкрыта ў доме б. таргова-прамышленага клюбу (на Лукішках). Работа на мейсцу ўжо пачалася.

× **Ваенные ўгодкі.** 23 мая мінулі тры гады ад дня ваеннага выступленьня Італіі проці сваіх старых саюзьнікаў.

× **Параходная паездка ў Вэркі.** Што цяпер ужо мір, найляпей відаць і с таго, што на другі дзень Сёмухі віленцы наладзілі паездку параходам у Вэркі, зусім, як перад вайной. Дый публіка рабіла ўражэньне чыста мірнага часу. Нейкі пан меў на сабе зусім новые парадные жоўтые чэравікі, другі—новы англіцкі касьцюм, а адна дама ела нават... чэкаляду! На кароў, якіе пасьвіліся на бе-

Францішк Олехновіч.

На Антокалі.

п'еса ў 3 актах са сьпевамі і танцамі.

(Гл. „Гоман“ № 41).

З'ява 2.

ЮЗЮК і ЗОСЬКА.

ЗОСЬКА.

(Уходзіць ціха з левага боку, разгледаецца па пакоі, пасьля прыбліжаецца да Юзюка. Апранута ў стары пэркалёвы каптанік; рукавы закасаны выжэй локця. Засланяючы рукамі вочы Юзюку:) Хто? хто?

ЮЗЮК.

А хто ж бы другі, калі не панна Зося.

ЗОСЬКА.

Згадаў! За тое можэ пацалаваць. (Юзюк горача яе цалуе) Ой, ой! годзе ўжо! Годзе... Ці бацька яшчэ не вярнуўся?

ЮЗЮК.

Яшчэ не. Я так сама нецярпліва яго чэкаю, бо трэба шнуркоў і воску...

ЗОСЬКА.

Абед ужо гатоў — астыгне... Пэўне сядзіць гдзе ў якім шынку!.. Ах, гетые мужчыны!.. І пан Ігнат сьпазьняецца сягоньня..

ЮЗЮК.

А што панне Зосі да пана Ігната?

ЗОСЬКА (жартуючы).

А? зайздрасць?—бо я закахалася ў ім! (іншым тонам)—бо абед астыгне!

ЮЗЮК.

Зосечка!.. панна Зося! Я вас вельмі прашу: скажэце мне, ці вы запраўды мяне кахаеце?

ЗОСЬКА (нецярпліва).

Ах, заўсёды аб тым самым!.. Канечна?

ЮЗЮК.

Так,—бо так прыемна чуць гэткае слова!

ЗОСЬКА.

Ці ж канечна трэба чуць «слова», калі гэта само сабой разумеецца. Вы нічога б іншага не рабілі, толькі ўздыхалі ды казалі: кахаю!... кахаю!...

ЮЗЮК.

Чаму мы не кажэм сабе «ты», панна Зося?

ЗОСЯ.

«Ты»?... А не!... гэтага ня можна, гэта не выпадае!

ЮЗЮК.

А якжэ ж іншые? якжэж усе?

ЗОСЬКА.

Хто — іншые? якіе ўсе? Памятайце аб тым, што я яшчэ не нявеста ваша Тады — гэта ўжо іншая справа!

ЮЗЮК.

А калі ж гэта будзе?

ЗОСЬКА.

А ці я ведаю! Няма чаго сьпешацца. Папытайцеся ў мамы, што яна на гэта скажэ.

ЮЗЮК.

Сягоньня папытаюся, зара!

ЗОСЬКА.

О! нашто так хутка! маем яшчэ часу, пасьпеем! Трэба пачакаць, падумаць... Гэта ж на ўсё жыцьцё!

ЮЗЮК.

Дык будзем цяпер казаць сабе «ты»...

ЗОСЬКА.

О, не, гэта дык ня будзе. Я казала ўжо раз, што не, дык не! Калі прывыкнем казаць сабе «ты», то можэм забыцца і пры людзёх скажэм сабе «ты», а тады што людзі падумаюць? Мы ж жывем у аднэй кватэры...

ЮЗЮК.

Значыцца, вы мяне не кахаіце, калі думаеце аб тым, што людзі скажуць!

ЗОСЬКА.

Ах, ізноў тое самае: кахае, не кахае!.. (цалуе яго). Вось маеш! Кахае цяпер, ці не кахае?

разі Вельлі, небачэны праз чатыры гады абраз зрабіў сільнае ўражэньне; спутаные коні так сама былі відочна здзіўлены відам параходу...

Між Вільняй і Вэркамі надалей параход будзе хадзіць акуратна.

× **Пастаянные параходные зносіны між Вільняй і Вэркамі** пачынаюцца ад 24 мая. Параход з Вільні выходзіць а 8 і 11 гадз. перад абедам і а 2, 5, 8 і 10 г. 30 м. пасьля абеду. З Вэрак ідзе а 7 г. 10 м. перад абедам і а 1, 4, 7 і 9 г. 30 м. пасьля абеду.

× **Спіс населеных мейсц у Litauen-Nord** паступіў у прадажу па цане 7 марак у Abteilung C VII.

× **Паляваньне** Па загаду Глаўнакамандуючага на Усходзі да 31 мая можна біць самцоў вялікшага лясного птаства, а паляваньне на казлоў пачынаецца 1 чэрвеньня.

× Тэмпэратура. Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошніе дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
21 — 22	+ 25,3°	+ 8,5°
22 — 23	+ 25,9°	+ 6,0°

З усяго Краю.

Польская гаспадарка на Беларусі.

Дзеля характэрыстыкі „слаўных“ учынкаў польскага войска на Беларусі ня будзем падаваць тут такіх фактаў, як поўнае руйнаваньне беларускіх вёсак (рэквізыція усіх прадуктаў да апошняй крошкі — разам з насеньнем), як катаваньне „непакорных“ селян — часта 60 гадовых старых — за тое, што бараніліся ад рабунку ўсяго іх меньня, як разстрэлы на аснове нейкага ні на чым неаснованага падазрэньня і г. д.: усё гэта організованая гаспадарка палякоў на „братняй“ зямлі Беларускай. Мы затое перэдрукоўваем словы польскай газэты «Dzien. Polski» (№ 134) аб тым, які дух пануе ў гэтай арміі, каторая хваліцца сваім „ладам і слухмянасьцю“, апіраючы на гэтым сваё права чыніць суд і расправу над беларускімі селянамі.

«Dz. P.» пішэ даслоўна:

Польскіе салдаты патроху ачышчаюцца ад большэвіцкіх наплываў. Аднак, зараза яшчэ трывае. Здараюцца факты страшэнна балючые. Напр. месяц таму назад варта абакрала палявую кассу 6 палка (113.000 руб.). Напасьці грабежцаў з учасьцем салдатоў усё яшчэ здараюцца, — хаця і ўсё радзей. Грабежцы — ў мундзірах, ці без мундзіраў — ідуць пад палявы суд. На склонах валаў бабруйскай крэпасьці адбылася ўжо не адна экзэкуція“.

Польская «чырвоная армія».

У Вітэбску, захопленым большэвікамі, ўся работа беларускіх організацій прыпынілася. Беларускіе грамадзкіе і палітычные працаўнікі часьцю разагнаны, часьцю тэррорызованы і прымушэны працаваць патайно, нелегальна. Затоеж шырокі прастор далі большэвікі палякам — так-званаму „1 му польскаму рэволюцыйнаму палку“. Гэты полк належучы афіцыальна да „Чырвонай арміі“, нічым ня розніцца ад войска „оккупатара“ Бабруйска, Довбор-Мусьніцкага: ён так сама абходзіцца с чужым дабром, так носіць польскіе караневаные арлы і г. д. І ў Вітэбску народ больш пакутуе ад польскай окупаціі, чымсі ад большэвіцкай. Вітэбская организація Беларускай Соцыялістычнай Грамады, старшынёй каторай ў Вітэбску быў М. Мелешка, працуе нелегальна. Ваенная рада разагнана і закрыта.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

Абозы, абозы і абозы Едуць у Менск, едуць з Менску. Гэта розные крамнікі з Даўгінава, Докшыц, Глыбокага, Ільлі, Крайску і др. Хто вязе тавар з Менску (болей усяго табаку і мануфактуру), а хто ў Менск (яйкі, куры, масла і др.), а шмат хто едзе проста ў Менск «па цану». Тавару дома хватае, толькі цаны ня ведаюць, бо кожные тры дні ўсё новые цэны...

Спатыкаюцца знаёмые людзі. Талкуюць аб «керэнках», аб старых і аб немецкіх грашах. Па вёсках ідуць толькі «мікалаеўскіе» грошы. Сустрэчны—папярэчны талкуюць аб палітыцы. У газэціны ўжо не заверчываецца сялядзец, таксама не ўжываецца газэта на «банкроткі», а перэдаецца з рук у рукі, як скарб. Нават неграматные людзі і то пачалі смакаваць газэту.

Спатыкаю на гасьцінцу знаёмага чэлавека з блізкай вёскі.

— Здароў, сусед Пархвен!

— Здароў!

— Чаму так пастарэў? — пытаюся ў яго.

— Ад бяды... — кажэ Пархвен. — Э-хэ-хэ, чатыры гадкі вайны... Адзін сын згінуў зусім на вайне. Другі — ў палоне, ды ўжо даўно весткі ад яго не маю, а трэйці яшчэ не вярнуўся з Расеі. Гэта не жартачкі якіе...

Пархвенківае сваей бядовай сівой галавой і сумнымі вачыма пазірае на мяне. Не жартачкі — згаджаюся я з ім. Але не пасьпеў я яшчэ слова дакончыць, як Пархвен адскочыў ад мяне ў другі бок кудысь рвануўся і паляцеў. Бачу ажна йдуць с хатомкамі за плячыма тры запыленые спацеўшые салдацікі, а Пархвен, мабыць, хочэ даведацца „Што чуваць? Скуль і куды ідуць?“

Гэта „што чуваць?“ разлаецца цяпер усюды. Кожнага цікавіць доля тутэйшай зямлі, — да каго яна будзе належаць. Кожны талкуе па свойму і небыліцы творацца на кожным кроку. Кожны нецерпяліва чакае канца. Кожны ўжо хацеў бы троху адпачыць і душой і целам ад усей гэтай завірухі. І праклінаюць людзі сваіх быўшых агітатараў, якіе вучылі іх, як правесьці «волю народную».

— „Гэта «раратьі» (аратары) нас давалі да таго, што ні ў зад, ні ў перад», — жалюцца вясковые людзі. — Што гэта будзе? — непакояцца яны, бо пужаюцца караў за большэвізм..

Яны напамінаюць аглушэных, узрослых дзяцей у сваей шчырасьці, у сваей массовай цемнаце.

(«Б Ш.»)

ДРУСКЕНІКІ. У 1830 гаду селянін Францішк Суровы з малой вёскі Друскенікі заўважыў, што яго жывёла, піўшая ваду с крыніцы на балоці, незвычайна добра гадавалася. Напрабаваўшы тэй вады, ён перэканаўся, што яна мае асабліві смак. Тады ён надумаў заняцца знахарствам, і яго ўдачнае лячэньне прыдбала яму славу на ўсю ваколіцу. Сваей цудоўнай вадой ён лячыў ад усіх хвароб. Францішк шыбка разбагацеў і паміраючы, адкрыў свой сэкрэт сыну Бэнэдыкту. Той яшчэ болей павялічыў сваю практыку, але з ім здарылося беда: яго сяліба згарэла, а паліція арэштавала яго, вінавацючы ў падпале. Каб асвабадзіцца, яму прышлося заплаціць вялікіе грошы. Вышаўшы на волю, ён пачаў п'янчыцца ды напіўшыся, выкрыў свой сэкрэт. З лячэбнай вады пачалі карыстаць усе, а Бэнэдыкт і яго дачка памёрлі ў вялікай беднасьці.

Украіна.

Беларусы на Украіне

Закінутые далёка ад свае бацькаўшчыны беларусы-ўцекачы і быўшые ваенные наладзілі на Украініе акружные Беларускіе Рады ў Харкаве і Кацярынаславе.

Новы украінскі ўрад адносіцца да беларускіх організацій вельмі спагадліва.

БЭРЛІН. «8 Uhr-Abendblatt» пішэ:

«Калі расейская армія была дэмобілізована і распушчэна, салдаты, гаварыўшые па польску, пачалі злучацца на Украіне ў ваенные дружыны, с каторых у канцы канцоў утварыўся 2 і 3 польскі корпус. Не маючы ані грошы, ані яды, гэтые войскі сцягівалі на сябе ўсё часьцей напасьці аружных селян, каторых страшэнна абурывалі штодзенные польскіе прымусовые рэквізыціі. Гэтак дайшло — асабліва ў межах аўстрыяцка-вэнгерскай окупаціі — да крывавых бітваў між салдатамі 3 польскага корпуса і украінцамі. Каб недапусьціць далейшага праліваньня крыві, немецкая і аўстрыяцка-вэнгерская ваенные каманды, умовіўшыся з украінскім урадам, пастанавілі назначыць палякам на жыцьцё асобные памяшчэньні. Аднак трэба было канечна шыбка выясьніць міжнароднае палажэньне гэтых польскіх войск. Дзеля забэспечэнь-

---

(пяе):

Што цябе вельмі кахаю,
Ты сам добра аб тым знаеш,
Мне с табою бытцым ў раю,
Ціж ты гэта не згадаеш?
Ах, ах! Ты ўсё стогнеш, ты ўсё плачэш!
Ах, ах! Як груган над долей крачэш.

ЮЗЮК (пяе):

Зосенька, мая галубка,
Як не плакаць, не журыцца?—
Ты мяне разлюбіш хутка —
Чужой жонкай будзеш звацца!
І вось сонца скрозь свае слзы не бачу,
Ды ўздыхаю, ды цішком я горка плачу.

РАЗАМ:

Гэй, каханьне — гэта кветка,
Што ў жыцьці раз зацьвітае.
У душы тады дзіўна гэтка,
Бытцым у пекле ты і ў раю.
Люблю, люблю!—вось як пекна зычыць гэта!
Люблю, люблю, праз цябе не бачу сьвета!

ЗОСЬКА (кажэ):

Вось маеш, чаго хацеў! Рады васпан?

ЮЗЮК.

Зосенька мая! (хочэ яе абняць).

МІХАЛІНА (клічэ за сцэнай)

Зоська!

ЗОСЬКА.

Не! адчапіся! німа часу. Вось чуеш, мама мяне клічэ. Сягоньня шмат работы, — мыем бялізну, — а тутака, як на злосць бацька і пан Ігнат не прыходзяць на абед.

З'ява 3.

ТЫЕ Ж і МІХАЛІНА.

МІХАЛІНА.

(Таўстуха, рукавы закасаны так як і ў дачкі, мае на сабе хвартух. Уходзіць з левага боку і глядзіць з падазрэньнем на маладых).

МІХАЛІНА.

Бойся ж Бога, дзяўчына! Работы шмат, а ты кінула ўсё і сядзіш тутака! Памятай, што сягоньня субота, — каліж мы пасьпеем ўсё кончыць?

ЗОСЬКА.

Я шукала мыла.. (выходзіць).

З'ява 4.

ЮЗЮК і МІХАЛІНА.

МІХАЛІНА.

Мыла? якога мыла? Мыла на паліцы (сядаючы змучэная). Ах, цяжка без слугі! Так трудна цяпер знайсьці добрую дзяўчыну, аж страх! Ня ведаеце якой?

ЮЗЮК.

Я? скульжэ? але пастараюся...

МІХАЛІНА.

Пане Язэпе! па абедзе скокніце да Соркі, да фактаркі, папытайцеся яе.. Бо так даўжэй жыць нельга. Ужо ўвесь тыдзень мардуюся без слугі. Дзякаваць Богу, яшчэ не так кепска, каб трэба было на гэта шкадаваць!...

ЮЗЮК.

Добра, панечка; пасьля абеду я скокну да Соркі.

МІХАЛІНА.

Каб толькі не палятуха, бачце! . — Ці майго яшчэ не было?

ЮЗЮК.

Не, яшчэ не было.

МІХАЛІНА.

Што гэта значыць, што ён так доўга не варочаецца! Пайшоў аднясьці работу і купіць скуры, і засідзеўся! А работы пэўне шмат?

ЮЗЮК.

А ёсць, даволі...

МІХАЛІНА.

Вось маеш яго! работа тутака чэкае на яго, а ён пэўне спаткаўся гдзе-колечы са сваімі кумпанамі, такімі ж мачымордамі, як сам, і сядзіць гдзесь у карчме, забываючыся аб жонцы, дзіцяці, — аб усім свеце!.. Ах гэта нешчасьце з гэтымі мужамі!..

ЮЗЮК.

Ціж ужо ўсе такіе?

МІХАЛІНА.

Якіе?

ЮЗЮК.

А дык... п'яніцы!

(Далей будзе).

ня нашых опэрацій на Усходзі мы не маглі сцярпець чужацкіх войск на сваіх тылах. Гэтак сама справа забаспечэньня гэтых войск грашмі і стравай ставалася ўжо больш пялючай і пачала дрэнна адбівацца на моральнасьці і слухмянасьці салдатоў. На конфэрэнцыі ў Кіеві дзеля закончэньня ўсіх неразвязаных спраў дэлегаты нямецкай і аўстрыяцка-вэнгерскай глаўнай каманды пастанавілі абязброіць гэтые польскіе дружыны і паслаць іх у іхнюю бацькаўшчыну".

КІЕЎ (В.Т.Б). На чэсць нямецкага міністра ф. Вальдов адбыўся банкет, на каторым быў міністэр прэзыдэнт Лызогуб і іншые вышэйшые украінскіе чыны. Нямецкі пасол барон ф. Мумм высказаў цьвёрдае пераконаньне, што пасьля пабеднага міра нямецкая аружная помач маладой дзержаве абернецца ў трывалае мірнае супрацоўніцтва на культурным, экономічным і палітычным грунці. «У Нямеччыне зусім шануюць жаданьне украінскага народу разьвіваць сваю будучыну на дэмократычнай аснове, і тамака пануе цьвёрдае пераконаньне, што побач с пачатай ужо фінансовай рэформай правядзеньне канечна патрэбнай зямельнай рэформы і пасьледавацельная культурная палітыка на нацыональным грунці будуць служыць крэпкай асновай гасударственага будоўніцтва».

КІЕУ. На просьбу Троцкэга спыніць ваенные чыннасьці на фронці украінскі ўрад заявіў, што вайна на сухапуцьці можэ быць цяпер спынена, бо Украінская зямля ўжо ачышчэна ад чырвонай гвардзіі. Аднак ваенные загады проці чорнаморскага флоту могуць быць спынены толькі тады, калі ўсе параходы вернуцца ў Севастополь і калі Новоросійск будзе адкрыт для руху судзен.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

БЭРЛІН. Фінляндцы вызвалілі ад чырвонай гвардзіі ўвесь свой край. На паўночным узьбярэжжы Кронштацкага заліва незалежная Фінляндзія сягае безмала да самае брамы Пецярбурга.

БЭРЛІН. Хаця расейцы, згодна з мірнай умовай, пакінулі Пэрсію, аднак, яны паддзержываюць зносіны з англіцкай арміей, якая тамака знаходзіцца.

Удача большэвікоў у Баку, каторым яны ізноў заўладалі, тлумачыцца паддзержкай англічан.

МАСКВА (Гавас). С Ташкенту наказываюць, што з'езд саветаў аб'явіў Туркестанскую рэспубліку. Новая рэспубліка прылучыцца да Расейскай фэдэрацыйнай рэспублікі. З Масквы выехала спэцыальная камісія дзеля вызначэньня граніц новай рэспублікі. Аб'яўлена агульная амнэстыя.

ПЕЦЯРБУРГ (В.Т.Б.). 20. V. Замест „Русск. Слова" выходзіць цяпер „Нашэ Слова". Яно пішэ:

Пад маршалкоўствам Крыленкі заседае большэвіцкая камісія дзеля судовага сьледзтва аб быўшым цару, каторага вінавацяць у гасударственым пэраварoці і перамене выбарнага права ў Думу, ў незаконным карыстаньні з грамадзянскіх грошаў і ў іншых праступках.

Эскадрон латышскіх стральцоў послан у Табольск, каб прывезьці цара ў Маскву.

ІРЛЯНДЗІЯ.

РОТТЭРДАМ. У Ірляндзіі шырыцца проклямацыя «з'еднаўшыхся ірляндцаў», у каторай паміж іншым кажыцца:

«Настаў час дружнага адпору англіцкаму зьдзеку і гвалтам. Урад праступнага Льлёйда Джорджа губляе веру ў памысны канец вайны. Англіцкі ўрад вінавапіць цяпер вас, вольных ірляндцаў, у здрадлівай тайнай змове з Нямеччынай. Не давайце ашукаць сябе англіцкім брахуном. Мы хочэмо адважна і без ніякае здрады дабіцца для сябе волі».

Пад проклямацыей падпісаліся 40 прэдстаўнікаў ірляндзкіх оргнізацій. Іх усіх арэштавалі і пасадзілі ў вастрог у Лімрыку.

З усяго сьвету.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ (В.Т.Б.). Аг. Мілі. 19 мая а 4 гадз. паабедзі аўстрыяцкі імператар Кароль з імператрыцай Зытай прыбылі сюды і былі сустрэчэны султанам, турэцкімі прынцамі і вышэйшымі чынамі. Прывітаньне абодвых монархаў было вельмі сэрдэчнае.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкіе апавешчэньні

22. V. Заходні тэатр:

У ваколіцах Кэмэля — жывейшы агонь. На поўначы ад Кэмэля і на поўдні ад Лёкр адбіты ў вечары сільные мейсцовые штурмы ворагаў. Наабапал Ліс і на канале Лябассэ—сільны агонь. Між Арра і Альбэр варожая артылерыя выявіла жывейшую чыннасць.

Адна з нашых лятучых эскадр у начы з 20 на 21 зьнішчыла вялікіе французскіе склады амуніціі пры Бляжж.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

НЬЮ-ІОРК (Рэўтэр). Прэзыдэнт Вільсон сказаў прамову, у каторай між іншым заявіў:

„Мы ня можэм быць парушэны ў нашай цьвёрдай пастанове выіграць вайну якой колечы няшчырай спробай заміраньня. Я пазнаёміўся с сэкрэтнымі прэдлажэньнямі і пераканаўся, што яны—няшчырые. Яны—толькі спроба дайсьці свабоды чыннасьцей, асабліва на ўсходзі, і правясьці пляны заваеваньняў і эксплуатацыі. Што датычыцца мяне, дык я хачу стаяць як на старане Франціі, так і на старане Расеі. Безрадные патрабуюць прыяцеляў і помачы. Слава гэтай вайны будзе для нас у тым, што мы ў ёй ня мелі самалюбных мэт. Абавязак вымагае ад нас, каб адзін аднаму памагаў і каб у гэтай вайне ніхто не карыстаўся коштам другога.

АМСТЭРДАМ (В.Т.Б.). Вільсон у сваей прамове у Нью-Іорку казаў далей:

„Першая павіннасць—гэта выіграць вайну, ды пры гэтым выіграць яе ў вялізарных размерах. Я недаўна чуў, што мы павінны выставіць 5 мільёнаў войска. Чаму абмежывацца пяцьцю мільёнамі? Я прасіў Конгрэс не назначаць граніц, бо Конгрэс, таксама, як і мы ўсе, жадае, каб дзеля вайны быў выкарыстан кожын параход. Калі ў Нямеччыне хто-колечы думае, што дзеля сваей карысьці мы згодзімся каго-колечы прысудзіць на ахвяру, дык ён мыліцца. Я скажу, што мы вядзем барацьбу за чэлавечаства. Калі нашы ворагі жадаюць міра, дык яны павінны праз сваіх паўнамочнікаў палажыць на стол свае варункі. Тады мы будзем ведаць, с чым мы маем дзела. Сталетні мір ня мог так з'еднаць наш народ, як з'еднаў яго апошні год. Від, каторы адкрываецца перад нашымі вачыма,—гэта барацьба чатырох націй, каторые самалюбна дабіваюцца пашырэньня сваіх граніц, проці 25 ўрадаў, якіе прэдстаўляюць вялікшую часць сьвету".

ЛОНДОН (Рэўтэр). У часе налёту ў нядзелю забіты ў Лёндоне 17 мужчын, 14 кабет і 6 дзяцей; ранены 83 мужчыны, 49 кабет, 23 дзяцей. У правінцыі ранены 2 мужчын, 3 кабеты і 1 дзіця, ды зроблено многа шкод у дамох і зьнішчэно іншае дабро.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). Сільные нямецкіе лятучые эскадры атакавалі ізноў Лёндон у начы з 19 на 20 мая. Паводлуг чысла самалётаў і скінутых бомб гэта найвялікшы з усіх быўшых дагэтуль налётаў на Лёндон. Заўважэны сур'ёзные рэзультаты ў Сіті і між адміралцействам і вэст-індзкімі докамі. У сярэдзіне места заўважэны чатыры вялікіе пажары. Мы атакавалі з добрай удачай також Дувр, Хэльмсфор, Чэтам і Саўзэнд.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). У Сяродземным моры нашы падводные лодкі затапілі 5 параходаў ёмкасьцю разам 22.000 тонн.

АПАВЕШЧЭНЬНЕ.

Тымчасовые сьведоцтвы 5% даўговых запісаў і $4\frac{1}{2}$% скарбовых абліrацій VII ваеннай пазыкі могуць быць заменены на пастаянные сьведоцтвы с працэнтнымі купонамі, пачынаючы ад

27 мая сёлетняга году.

Замена адбываецца ў «Umtauschstelle für die Kriegsanleihen», Berlin W 8 Behrenstrasse 22. Апрыч таго, меняць іх будуць усе аддзелы Імперскага Банку, пры якіх ёсць касы, да 2 сьнежня 1918 году без ніякае платы. Пасьля гэтага тэрміну тымчасовые сьведоцтвы могуць быць заменены яшчэ толькі беспасрэдна у «Umtauschstelle für die Kriegsanleihen» у Бэрліне.

Тымчасовые сьведоцтвы трэба падаваць у паказаные мейсцы перад абедам разам з рэестрам іх, дзе яны ўпісываюцца ў парадку паводлуг іх цэннасьці, а ў межах аднэй цаны — паводлуг нумэроў. Для 5% імперскай пазыкі і для $4\frac{1}{2}$% абліrацій імперскага скарбу павінны быць зроблены асобные рэестры. Прымернікі дзеля гэтага можна дастаць ва ўсіх аддзелах Імперскага Банку.

Фірмы і касы павінны на падаваных імі тымчасовых сьведоцтвах справа над нумэрам паперы стаўляць сваю пэчатку.

Значнае чысло тымчасовых сьведоцтв 1, 3, 4, 5 і 6 ваенных пазык дагэтуль яшчэ не заменено на пастаянные паперы с працэнтнымі купонамі на 1 красавіка 1915 г., 1 кастрычніка 1916 г. 2 студня, 1 ліпня і 1 кастрычніка 1917 г. і 2 студня сёлетняга году. Валадзельцы дзеля свае жэ карысьці павінны магчыма хутчэй падаць гэтые тымчасовые сьведоцтвы дзеля замены у «Umtauschstelle für die Kriegsanleihen», Berlin, W 8, Behrenstrasse 22.

Бэрлін, у маі 1918 г. **REICHSBANK-DIREKTORIUM.**

Havenstein. v. Grimm.

Друкавана у друкарні М. Кухты. Выдавецтва «Гоман.» Рэдактар Язэп Салавей.